а) жилые строения, принадлежащие колхозам (таблица 4, форма № 1—журнал учета основных производственных показателей колхоза);

б) строения колхозников, рабочих и служащих (таблица 3, форма № 2);

в) строения единоличников (таблица 3, форма № 3).

При этом из книг нужно выбирать записи только о тех строениях, которые находятся на территории данного населенного места (в книгах иногда записи ведутся по всему сельсовету в целом, без разделения на отдельные населенные места).

Если на территории сельсовета расположены совхозы, МТС, фабрично-заводские, железнодорожные и другие предприятия, следует установить числятся ли все принадлежащие им жилые строения в книгах сельсоветского учета. Если не числятся, их следует при записях в список населенных мест включить.

Хозяйства. Число хозяйств (графа 5 и графа 9 списка) должно быть получено из „списка хозяйств, об'единяемых сельсоветом" (форма № 4) и „списка лиц, временно проживающих на территории сельсовета" (форма № 4-а). При пользовании формой № 4 нужно проверить, все ли хозяйства вписаны в этот список и, кроме того, разметить хозяйства по населенным пунктам, где они находятся. Если записи в ф. № 4 не гарантируют включение всех хозяйств сельсовета, следует делать подсчет хозяйств по формам №№ 2 и 3, добавляя хозяйства временно проживающих (форма № 4-а).

Население. Особо тщательно должно быть установлено по каждому населенному месту население.

Количество населения, проживающего в данном населенном месте (графа 6 и графа 10 списка), получается путем

подсчета числа лиц в каждом хозяйстве по записям в форме №2 (таблица 1) и форма №3 (табл. 1), включая всех временно отсутствующих. Сюда должно быть прибавлено временно проживающее население, записанное в список (форма № 4-а).

Кроме того, устанавливается нет-ли на территории сельсовета рабочих и служащих, живущих в фабрично-заводских, железнодорожных и других помещениях и незанесенных в сельсоветские списки. Если таковое население обнаружится, оно должно быть обязательно учтено. Сведения о численности этого населения получаются у администрации соответствующих предприятий.

При заполнении граф списка о числе жилых строений, хозяйств и, в особенности, о численности населения было бы чрезвычайно вредно и совершенно недопустимо подходить к сельсоветскому учету формально, без критики. В книгах сельсоветского учета, могут быть обнаружены пропуски строений, хозяйств и населения. Все такие пропуски в книгах сельсоветского учета необходимо немедленно устранить. Важнейшее требование, которое предъявляется к списку населенных мест, наряду с исчерпывающим перечнем населенных мест, заключается в том, чтобы число жилых строений, хозяйств и населения на 1 января 1938 года было безусловно полное, без каких-либо пропусков. Участковый инспектор несет персональную, личную ответственность за правильность и полноту списков населенных мест.

С внешней стороны списки должны составляться весьма аккуратно, чисто, четко. Они обязательно должны быть написаны чернилами. Никакие отступления от установленной формы не допускаются.

Необходимо иметь в виду, что цифра населения по материалам сельсоветского учета на 1 января 1937 года будет использована только для составления районных оргпланов. При проведении переписи эти материалы как счетчикам, так и инструкторам ни в коем случае выдаваться на руки не должны.

Списки населенных мест по сельсовету должны быть подписаны участковым инспектором. Полнота и правильность списка подтверждается подписью председателя сельсовета.

Списки должны храниться, как метериал, не подлежащий оглашению. Запрещается кому бы то ни было передавать эти списки или снимать с них копию без разрешения начальника УНХУ.

Ниже приводится образец заполненного списка населенных мест.

Центр. Упр. Нар.-Хоз. Учета
ГОСПЛАНА СССР

Всесоюзная перепись населения 1939 г.

СПИСОК НАСЕЛЕННЫХ МЕСТ (образец)

Республика, край, область ______________________

Район ______________________

Сельсовет Щукинский

№№ по порядку	Наименование населенного места	Тип населенного места (деревня сторожка и т. д.)	В данном населенном месте числится по материалам сельсоветского учета на 1/I 1938 г.			В том числе отдельно стоящие жилые строения данного населенного места					Примечание
			Жилых строений	Хозяйств	Населения	№№ по пор.	Наименование строений (школа, больница, дом Иванова и т. п.)	В них числится по материалам сельсоветского учета на 1/I 1938 г. Хозяйств	В них числится по материалам сельсоветского учета на 1/I 1938 г. Населения	Расстояние от окраины основного населенного места (в клм.)	
1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12
1	Новое Щукино .	Деревня	58	75	362	—		—	—	—	
2	Старое Щукино .	»	195	230	991	1—2	Щукинская средняя школа	2	6	0,5	
						3	Мельница № 16 . . .	1	4	0,5	
						4—6	Нефте-склад	4	11	1,0	
						7	Охотничья изба	—	—	8,0	
3	Поселок при Щукинской МТС .	Поселок при МТС	2	11	28	—	—	—	—	—	
4	Боровиха . . .	Деревня	52	60	153	1—4	Пасека колхоза „Новь"	4	10	0,3	
						5	Дом сторожа Петрова .	1	2	0,2	
5	Раз'езд 541 клм.	ж.-д. раз'езд	2	4	9	—	—	—	—	—	
6	Будка 518 .	ж.-д. будка	1	1	3	—	—	—	—	—	

ІНСТРУКЦЫЯ

да складання спісаў домаўладанняў

І. АГУЛЬНЫЯ ЎКАЗАННІ

Складанне спісаў домаўладанняў з'яўляецца важнейшай падрыхтоўчай работай да перапісу насельніцтва ў гарадах.

Спісы домаўладанняў неабходны:

а) для правільнай разбіўкі тэрыторыі гарадскіх паселішч на перапісныя аддзелы, на інструктарскія і шчотныя ўчасткі;

б) у якасці кантрольнага матэрыяла для забеспячэння пры перапісу паўнаты ўчота насельніцтва.

Для паспяховага правядзення работы па складанню спісаў домаўладанняў, неабходна ў кожнай вобласці, краі, рэспубліцы правесці наступныя мерапрыемствы, прадугледжаныя ў раздзеле 5 цыркулярнага ліста ЦУНХУ ад 27/Х—37 г.

1. Устанавіць граніцы гарадскіх паселішч.

Пры праектаванні граніц гарадскіх паселішч неабходна выходзіць з існуючых адміністрацыйных граніц гарадскіх паселішч (тэрыторый, знаходзячыхся ў веданні горсовета ў) выкарыстоўваючы таксама матэрыялы па ўстанаўленню граніц пры выбарах у советы (граніц выбарчых участкаў).

У склад гарадскіх паселішч, акрамя асноўнага масіва, павінны быць уключаны ўсе асобна размешчаныя кварталы, дамы, а таксама населеныя месцы, маючыя свае назвы, у радзе выпадкаў лічачыяся прыгарадамі, калі яны кіруюцца горсоветам данага гарадскога паселішча.

У абласцях, дзе маюцца населеныя месцы, кіруемыя сельсоветамі, падпарадкаванымі горсоветам (якія ў даным выпадку ў адносіне да сельсоветаў выконваюць функцыі райвыканкомаў),—гэтыя населеныя месцы ў склад гарадскіх паселішч не ўключаюцца і ўносяцца ў спіс населеных месц (сельскіх).

Састаў і адміністрацыйныя граніцы гарадскіх паселішч абавязкова павінны быць узгоднены з горсоветамі і райвыканкомамі.

Пастаўце ў вядомасць горсоветы і РВК, што матэрыялы перапісу насельніцтва па гарадскіх паселішчах будуць распрацаваны ў узгодненых імі адміністрацыйных граніцах.

2. Скласці новыя альбо ўдасканаліць маючыяся планы гарадскіх паселішч.

Да работы па складанню і ўдасканаленню планаў патрэбна прыцягнуць аддзелы планіроўкі і інвентарызацыі горсоветаў.

На планах усе кварталы, масівы і асобна размешчаныя населеныя месцы, уключаныя ў састаў гарадскіх паселішч, павінны знайсці чоткае і яснае адлюстраванне.

Планы гарадскіх паселішч і даведкі горсаветаў аб тым, што з імі ўзгоднены састаў і адміністрацыйныя граніцы гарадскіх паселішч, прадстаўляюцца ў бюро перапісу насельніцтва саюзных рэспублік не пазней 1 лютага 1938 г.

УНГУ абласцей, дзе маюцца населеныя месцы, кіруемыя сельсоветамі, падпарадкаванымі горсоветам, разам з планам горада прадстаўляюць карту ўсёй тэрыторыі горсовета з нанесенай на ёй адміністрацыйнай граніцай горада і тэрыторыі, кіруемай сельсоветамі.

3. Пры садзейнічанні горсоветаў, РВК і органаў РС міліцыі ўпарадачыць назвы вуліц, завулкаў, пляцоў і нумарацыю дамоў гарадскіх паселішч.

II. ПАРАДАК СКЛАДАННЯ СПІСАЎ ДОМАЎЛАДАННЯЎ

А. Работа мясцовых бюро перапісу насельніцтва

Мясцовыя бюро перапісу насельніцтва:

а) кіруюць усёй работай па складанню спісаў домаўладанняў, кантралююць гэту работу і адказваюць за якасць і тэрміны правядзення яе;

б) забяспечваюць горУНГУ, гарадскія і раённыя інспектуры інструментарыем—формамі спісаў і інструкцыямі па складанню спісаў домаўладанняў;

в) для фінансавання работ па складанню спісаў пераводзяць у горУНГУ, горінспектуры і райінспектуры неабходныя асігнаванні;

г) асаблівую ўвагу мясцовыя бюро павінны ўдзяляць буйнейшым гарадам сваёй вобласці, прымаючы ў складанні спісаў домаўладанняў непасрэдны ўдзел.

Б. Работа горУНГУ, горінспектуры і райінспектуры раёнаў, маючых гарадскія паселішчы

Уся асноўная арганізацыйная работа па складанню спісаў домаўладанняў праводзіцца ў буйных гарадах гарадскімі УНГУ альбо гарадскімі інспектурамі НГУ (горІНГУ), а ў астатніх горпаселішчах адпаведнымі раённымі інспектурамі.

ГорУНГУ, горІНГУ і райІНГУ па складанню спісаў домаўладанняў вытвараюць наступныя работы:

1. Згатаўляюць планы гарадскіх паселішч.

2. Прымаюць захады да ўпарадачэння назваў вуліц і нумарацыі дамоў, заручыўшыся адпаведнай пастановай горсовета.

3. Удасканальваюць адміністрацыйныя граніцы гарадскіх паселішч у натуры разам з райінспектарамі сумежных раёнаў.

Патрэбна мець на ўвазе, што ад гэтай работы залежыць паўната ахопа насельніцтва перапісам. Усе будынкі, знаходзячыся на граніцы горада, павінны быць уключаны ў спіс домаўладанняў альбо ў спіс населеных месц.

4. Выпрацоўваюць календарныя планы работ па складанню спісаў домаўладанняў, забяспечваючыя сканчэнне работы ў агульна ўстаноўлены тэрмін.

5. Разбіваюць гарадскія паселішчы на неабходную колькасць участкаў і згатаўляюць эксплікацыі з плана на кожны ўчастак.

6. Складаюць спіс домаўладанняў, падлягаючых перапісу ў асобым парадку.

7. Падбіраюць работнікаў (рэгістратараў), інструктыруюць, кантралююць і кіруюць іх работай.

8. Складаюць папярэдні спіс домаўладанняў.

III. СКЛАДАННЕ ПАПЯРЭДНЯГА СПІСА ДОМАЎЛАДАННЯЎ

Папярэдні спіс домаўладанняў складаецца па наступнай форме:

1. № па парадку.
2. Назва вуліцы, завулка, пляца і г. д.
3. № міліцэйскага ўчастка і № дома.
4. Назва ўстановы альбо прадпрыемства, якім належыць домаўладанне, альбо прозвішча домаўладальніка.

Крыніцамі для складання папярэдніх спісаў домаўладанняў служаць:

а) даныя гарадскіх бюро інвентарызацый;

б) спісы домаўладанняў, складзеныя пры папярэдніх работах да перапісу 1937 года. У абласных, краявых і рэспубліканскіх цэнтрах выкарыстоўваецца таксама дапаможны матэрыял перапісу 1937 года,—дамавыя спісы, ведамасці шчотчыка і інш. Патрэбна мець на ўвазе, што да гэтых матэрыялаў трэба падыходзіць крытычна;

в) спісы домаўладанняў, складзеныя горсоветамі і райсоветамі ў час падрыхтоўкі да выбараў у Вярхоўны Совет;

г) спісы, складзёныя для правядзення перапісу жывёлы 1-га студзеня 1938 года, і інш.

Спісы складаюцца пакварталььа. Кварталы на плане нумаруюцца чарговымі нумарамі ў цэлым па гораду, па асобных яго раёнах, альбо па сістэме, прынятай аддзелам інвентарызацыі. Кожны квартал павінен мець свой нумар.

У выпадках адсутнасці падзялення на кварталы, спісы складаюцца па асобных масівах, маючых вызначаныя граніцы, а пры адтутнасці гэтага рода масіваў—па вуліцах.

На будынкі, знаходзячыяся ўне кварталаў, складаюцца асобныя спісы. Кожнае домаўладанне заносіцца ў спіс асобным радком.

Домаўладаннем патрэбна лічыць дваравы ўчастак, маючы міліцэйскі нумар. Незабудаваныя ўчасткі прыроўніваюцца да забудаваных і заносяцца ў спісы.

Калі на дваравым участку, які значыцца пад адным міліцэйскім нумарам, знаходзіцца 2 ці больш жыллёвых будынкаў, належачых розным уладальнікам альбо іншым асобам і арганізацыям, якія карыстаюцца імі, дык будынак кожнага ўладальніка запісваецца асобным радком.

Калі пад адным міліцэйскім нумарам знаходзіцца рад дваравых участкаў, альбо буйных карпусаў, якія абазначаны дадатковай літарай альбо лічбовай нумарацыяй, дык кожны гэткі дваравы ўчастак альбо корпус запісваецца асобным радком, а дадатковы нумар ставіцца ў гр. 4 спіса побач з міліцэйскім нумарам дома.

Калі маецца адзін будынак, належачы двум альбо больш уладальнікам, ён запісваецца адным радком, а ў гр. 4 указваецца прозвішча аднаго з уладальнікаў.

Дваравыя ўчасткі, на якіх знаходзяцца больніцы, дамы адпачынку, прадпрыемствы, культурныя ўстановы і інш., таксама заносяцца ў папярэдні спіс.

Дваравыя ўчасткі і асобныя кварталы, занятыя спецыяльнымі аб'ектамі, у спісы домаўладанняў не заносяцца. Дваравыя ўчасткі, занятыя спецыяльнымі аб'ектамі часткова (флігель, кватэра і г. д.), патрэбна заносіць у спіс.

Спіс кварталаў і дваравых участкаў, цалкам альбо часткова занятых спецыяльнымі аб'ектамі, раённы альбо гарадскі інспектар загадзя ўзгадняе з адпаведнымі арганізацыямі.

Папярэднія спісы складаюцца гор(рай)ІНГУ ў 2-х экземплярах, па форме, прыведзенай у раздзеле III гэтай інструкцыі. Адзін экземпляр застаецца ў горУНГУ (горІНГУ і райІНГУ), другі выдаецца рэгістратару разам з планам яго ўчастка.

Папярэднія спісы домаўладанняў з'яўляюцца матэрыялам, не падлягаючым агалашэнню, і павінны хавацца ў адпаведным парадку.

IV. АБХОД ДОМАЎЛАДАННЯЎ І СКЛАДАННЕ КАНЧАТКОВЫХ СПІСАЎ

Абход домаўладанняў і атрыманне даных аб колькасці будынкаў, кватэр і колькасці насельніцтва з'яўляецца важнейшай аперацыяй, на якую павінна быць звернута асаблівая ўвага, пагэтаму работа гэта павінна праводзіцца кваліфікаванымі работнікамі, у першую чаргу работнікамі горУНГУ і горінспектуры, работнікамі і ўчастковымі інспектарамі, а таксама спецыяльна запрошанымі, у якасці рэгістратараў кваліфікаванымі работнікамі.

Рэгістратар атрымоўвае пэўны ўчастак у некалькі сумежных будаўнічых кварталаў горада. Рэгістратару павінны быць выданы:

а) пакартальны план яго ўчастка з нанесенымі на плане домаўладаннямі;

б) папярэднія пакартальныя спісы домаўладанняў;

в) неабходная колькасць форм спісаў і інструкцыя.

Да пачатку работ рэгістратар абавязан азнаёміцца ў натуры з адведзеным яму для работы ўчасткам і праверыць адпаведнасць размяшчэння ўчастка на плане. Патрэбна асаблівую ўвагу звярнуць на тое, каб не былі прапушчаны рагавыя дамы і асобна стаячыя будынкі (у не кварталаў), асабліва на акраінах гарадскіх паселішч.

Рэгістратар абходзіць у строга вызначаным парадку ўсе ўладанні, размешчаныя на яго ўчастку, і на кожны квартал складае асобны спіс домаўладанняў па наступнай форме.

Квартальны спіс домаўладанняў.

Рэспубліка, вобласць, край .... раён .... горад .... Раён горада .... аддз. міліцыі .... квартал, масіў № .... Апісанне граніц квартала ....

Парадкавы №	Назва вуліцы, завулка і г. д.	Міліцэйскі ўчастак і № дома	Назва ўстановы альбо прадпрыемства, якім належыць улад., альбо прозвішча ўладальніка	Лік усіх будынкаў	Лік кватэр	Колькасць насельніцтва	Подпіс упраўдома, арандатара альбо ўладальніка дома.
1	2	3	4	5	6	7	8

Рэгістратар абавязан складаць спісы на падставе даных, якія ён атрымоўвае пры абходзе домаўладанняў, *карыстаючыся папярэднім спісам толькі як дапаможным, кантрольным матэрыялам.* Аднак аб усіх разыходжаннях з папярэднім спісам рэгістратар павінен даць спецыяльнае тлумачэнне ў пісьмовай форме.

Указанні, даныя ў гэтай інструкцыі ў раздзеле III-м „Складанне папярэдняга спіса", акрамя ўказанняў аб крыніцах (п. п. а, б, в, г), адносяцца таксама да спіса, складаемага рэгістратарам.

Запіс ліку будынкаў, кватэр і колькасці насельніцтва

Па кожнаму домаўладанню рэгістратар устанаўлівае і запісвае ў спіс (гр. гр. 5—7) лік будынкаў (жыллёвых і нежыллёвых разам), кватэр і колькасць насельніцтва.

Лік будынкаў рэгістратар вызначае ў натуры шляхам абхода ўсіх жыллёвых і нежыллёвых будынкаў.

Будынкам трэба лічыць усякую пабудову, стаячую пад адным дахам, прычым мезаніны, брандмауэры і дробныя прыбудовы не лічацца парушаючымі бесперапыннасць даху.

Зямлянку, юрту, вагон, прыстасаваны для жылля, таксама патрэбна лічыць за асобныя будынкі.

Даныя аб ліку кватэр і аб колькасці насельніцтва рэгістратар атрымоўвае ў домаўладанні альбо ў домаўладальніка. У лік кватэр павінны ўключацца заселеныя падвальныя памяшканні, старожкі і іншыя заселеныя памяшканні.

Асабліва старанна павінна быць улічана насельніцтва. У гр. 7 спіса ўключаецца не толькі ўсё насельніцтва, занесенае ў дамавую кнігу, але і насельніцтва, якое па якіх-небудзь прычынах у дамавую кнігу яшчэ не занесена.

Як паказаў вопыт перапісу 1937 года, домакіраўніцтвы часам даюць няверныя, недакладныя звесткі. Пагэтаму неабходна да пачатку абхода домаўладанняў заручыцца пастановай горсовета, абавязваючай дамавую адміністрацыю падрыхтаваць і здаць рэгістратарам правераныя звесткі.

Правільнасць даваемых звестак адказная асоба з домакіраўніцтва, альбо ўладальнік, пацвярджае сваім подпісам у гр. 8-ай спіса.

Па сканчэнні абхода ўсіх домаўладанняў квартала і занясення ўсіх патрабуемых спісам звестак рэгістратар падлічвае ітогі ліку будынкаў, кватэр і насельніцтва (гр. гр. 5, 6, 7), падпісвае спіс і здае гарадскому альбо раённаму інспектару. *Ніякіх копій знімаць не дазваляецца.*

З знадворнага боку спісы павінны складацца вельмі акуратна, чыста, чотка. Яны абавязкова павінны быць напісаны чарнілам. Ніякія адступленні ад устаноўленай формы не дапушчаюцца.

V. ХАВАННЕ СПІСАЎ ДОМАЎЛАДАННЯЎ

Па сканчэнні абхода домаўладанняў ва ўчастках увесь матэрыял (канчатковыя спісы, папярэднія спісы, планы і лісткі з заўвагамі рэгістратараў) сканцэнтроўваюцца ў горУНГУ альбо ў гор(рай)інспектуры.

Сабраныя спісы і планы старанна правяраюцца. Пасля праверкі складаецца зводка па ўсяму гораду ў цэлым.

Кожны раённы інспектар, горінспектар (горУНГУ) пры арганізацыі работ па складанню спісаў домаўладанняў і спісаў населеных месц павінен выходзіць з таго, што колькасць насельніцтва, улічанага ў спісах населеных месц, і колькасць насельніцтва, улічанага ў спісах домаўладанняў, у суме павінны даць усё насельніцтва раёна. Не павінна быць насельніцтва, не папаўшага ні ў спіс населеных месц, ні ў спіс домаўладанняў. Калі спісы домаўладанняў складаюцца (з санкцыі ЦУНХУ) у сельскай мясцовасці, дык пры зводцы патрэбна ўлічыць, каб насельніцтва не папала ў падлік двойчы—па спісу населеных месц і па спісу домаўладанняў.

Спісы домаўладанняў з'яўляюцца матэрыялам, не падлягаючым агалашэнню, і павінны хавацца ў адпаведным парадку.

Бюро ўсесаюзнага перапісу насельніцтва 1939 года.

АБ ПАРАДКУ ЗАВЯДЗЕННЯ ПАГАСПАДАРЧЫХ КНІГ

Аддзел зацвярджэння справаздачнасці ЦУНХУ Дзяржплана СССР паведамляе, што парадак адкрыцця пагаспадарчых кніг іншых пярвічных дакументаў у с/сельсоветах на 1938 г. застаецца такім, як і ў мінулым годзе.

Журнал калгаса (ф. № 1) і пагаспадарчыя кнігі для гаспадарак калгаснікаў, рабочых і служачых (ф. № 2) змантыраваны на 2 гады (1938—39 гг.), але парадку іх адкрыцця на 1938 г. гэта не змяняе.

1. Пагаспадарчыя кнігі гаспадарак калгаснікаў, рабочых і служачых (ф. № 2), пагаспадарчыя кнігі гаспадарак аднаасобнікаў (ф. № 3) і спісы асоб, часова пражываючых на тэрыторыі с/савета (ф. № 4-а), павінны быць заведзены ў сельсоветах *шляхам суцэльнага абхода двароў у тэрытарыяльным парадку.*

2. Па скančэнні занясення гаспадарак (сем'яў і адзіночак), стала пражываючых у даным с/савеце, у пагаспадарчыя кнігі (фф. №№—2 і 3), у с/савеце нумаруюцца кнігі і гаспадаркі і складаецца спіс гаспадарак, аб'яднаемых с/саветам (ф. № 4), а затым ужо гаспадаркі заносяцца ў алфавітную кнігу.

3. Парадак нумарацыі кніг і гаспадарак захоўваецца такім, як у мінулым годзе (скразным па ўсяму с/савету).

Кожнай гаспадарцы даецца сталы нумар на ўвесь год.

Унізе асабовага лістка кожнай гаспадаркі з правага боку трэба прастаўляць пагаспадарчы нумар 1937 г.

4. У кожнай пагаспадарчай кнізе на вокладцы неабходна напісаць назву тых населеных пунктаў, гаспадаркі якіх занесены ў даную кнігу, а ў самой кнізе перад кожным населеным пунктам (калі іх у адной кнізе некалькі) зрабіць пракладку з назвай населенага пункта.

Гэта не вызваляе сельсоветы ад запаўнення дакладнага адраса на кожным асабовым лістку гаспадаркі.

Калі ў сельсовеце некалькі паселішч, то ў спісу ф. № 4 і ў ф. № 4-а ў графе „Увага" трэба прастаўляць назву населенага месца, дзе даныя гаспадаркі і асобы пражываюць.

Паколькі даны матэрыял ляжа ў аснову спісаў у прадстаячым перапісу насельніцтва, на яго паўнату, дакладнасць і добраякаснасць павінна быць звернута асаблівая ўвага.

5. У пагаспадарчыя кнігі пры абходзе двароў павінны быць занесены агульныя звесткі (тытульная частка асабовага лістка гаспадаркі), спіс членаў сям'і з усімі паказчыкамі,

зямля гаспадаркі, будынак, а ў аднааснбнікаў і сельскагаспадарчы інвентар.

У пагаспадарчай кнізе ф. № 2 у раздзеле І „Спіс членаў сям'і" не запаўняюцца графы 8, 11 і 13, у якіх будуць рабіцца адзнакі аб зменах у 1939 годзе.

6. У графе „Якую школу скончыў або дзе вучыўся" трэба пісаць: „скончыў сямігодку, дзесяцігодку, тэхнікум, ВУЗ"; для асоб, не скончыўшых ніякай школы, але навучаўшыхся,—трэба пісаць: „2 класы сямігодкі, 5 класаў дзесяцігодкі, 1 курс тэхнікума, 2 курс ВУЗ'а". Для асоб, нідзе не навучаўшыхся, але пісьменных, пісаць: „самаадукацыя, самавучка". Для асоб, нідзе не навучаўшыхся і не пісьменных—пісаць: „Непісьменны".

Дзецям да 8 год непісьменнасць не адзначаецца.

У графе „Аданака аб вучобе" адзначаецца той від школы, у якой вучань навучаецца: „сямігодка, дзесяцігодка, кароткатэрміновыя курсы птушкаводаў, агранамічны тэхнікум" і г. д.

Адзнакі робяцца скарочана, але скарачэнне павінна быць зроблена так, каб яно было зразумела.

7. У графе „спецыяльнасць" адзначаецца спецыяльнасць, як у сельскай гаспадарцы, так і ў нясельскай гаспадарцы. Калі даная асоба мае некалькі спецыяльнасцей, то яны павінны быць упісаны ўсе, незалежна ад таго, працуе даная асоба па спецыяльнасці ці не.

У графе „Месца работы і ў якасці каго працуе" праставляецца кім даная асоба працуе.

Напрыклад „Спецыяльнасць"—каваль, слесар, камбайнер; „месца работы і ў якасці каго працуе"—камбайнерам у МТС і г. д.

Для асоб, займаючыхся саматужна-рамесніцкім промыслам у сябе на даму (некааперыраваных), у графе „месца работы" адзначаецца: „на даму".

8. З асаблівай увагай трэба падыйсці да запаўнення графы адзнака аб адсутнасці на 1/І—38 г.

Усе члены данай гаспадаркі (сям'і), часова адсутнічаючыя на момант запісу 1 месяц і больш, адзначаюцца адсутнічаючымі, прычым у гэтай графе адзначаецца, з якога чысла, месяца і года адсутнічае.

Часова адсутнічаючымі лічацца члены сям'і, ушоўшыя на часовыя заработкі (у адыход), на вучобу, кароткатэрміновыя курсы і г. д. і не парваўшыя сувязі з гаспадаркай.

Члены сям'і, пражываючыя ўне данай гаспадаркі, сваім бюджэтам, хаця-б і звязаныя з данай гаспадаркай, напрыклад, прысылкай грошай, нават рэгулярнай, не могуць лічыцца членамі данай гаспадаркі і ў спіс членаў сям'і (хаця-б з адзнакай аб адсутнасці) занесены быць не могуць.

9. Учот асоб, часова пражываючых у даным сельсовеце (сезоннікаў, асоб, прыехаўшых у камандыроўку, на адпачынак на 1 месяц і больш), па ф. № 4-а вытвараецца адначасова з завядзеннем пагаспадарчых кніг і ва усіх сельсоветах без выключэння як у непашпартызаваных, так і ў пашпартызаваных.

10. Ва ўсім астатнім пры запаўненні пагаспадарчых кніг неабходна карыстацца ўказаннямі інструкцыі 1937 года.

ВЫПІСКА

з пратакола паседжання прэзідыума Механскага РВК

ад 19 лістапада 1937 года

Слухалі:

Аб становішчы ўчота па сельсоветах і калгасах раёна (дакл. інспектара наргасучота тав. Бажонка).

Пастанавілі:

Прэзідыум РВК адзначае, што на падставе вытваранай праверкі становішча ўчота па ўсіх 15 сельсоветах раёна і па 25 проц. калгасаў раёна ўчастковымі інспектарамі НГУ выяўлена, што становішча ўчота ў сельсоветах, запаўненне пагаспадарчых кніг—форма № 2-3,—актаў грамадзянскага стану здавальняючае, за выключэннем Механскага сельсовета. Не гледзячы на тое, што ў гэтым сельсовеце побач з сакратаром сельсовета тав. Рыбікавым увесь час працуе дадаткова на пасадзе статыстыка тав. Раманава, кнігі ўчота поўнасцю па ўсіх раздзелах не запоўнены (адсутнічае разноска па кнігах учота, заключных справаздач веснавой сяўбы, не запоўнен раздзел насельніцтва, не вядзецца ўчота прыбыцця і выбыцця насельнітва і інш.).

Тав. Рыбікаў, як сакратар сельсовета, не зрабіў ніякіх вынікаў для сябе з мінулагодняга рашэння прэзідыума РВК, па якому за бяздзейнасць аб'яўлена суровая вымова.

Побач з гэтым маюцца і такія сельсоветы, як Паташанскі, Горкаўскі, Саладухінскі, Обальскі і Зайкаўскі, у якіх таксама неахайна запаўняюцца раздзелы ўчота насельніцтва (выбыцця і прыбыцця насельніцтва), наглядаецца несвоечасовая дасылка ў ЗАГС кожнага другога чысла месяца копій актаў грамадзянскай рэгістрацыі. Гэтыя нядбайныя адносіны да своечасовай дасылкі ўстаноўленай апаратыўнай справаздачнасці маюцца амаль па большасці сельсоветаў.

Прэзідыум РВА адзначае, што яшчэ горш абстаіць справа з становішчам калгаснага рахункаводства, якое вядзецца па простай сістэме і пры гэтым неахайна. Так, па калгасу імя Будзённага, Горкаўскага сельсовета, „Чырвоная горка“, Паташанскага сельсовета, „Чырвоны Май“, Мехаўскага сельсовета, „Чырвоныя ткачы“, Езярышчанскага с/с, імя Варашылава, Саладухінскага сельсовета, імя Сталіна, Мехаўскага с/с, асабістыя рахункі калгаснікаў не запаўняюцца ад 3 да 8 месяцаў; разноска па натуральна-прадуктовых кнігах зацягнута, не своечасова заносяцца прыбыткова-выдатковыя дакументы ў касавыя кнігі; сістэматычна зрываецца адсылка аператыўных справаздач, у асаблівасці райЗА; не заносяцца па 1 і 5 месяцаў працадні ў працоўныя кніжкі калгаснікаў. Не гледзячы на гэтыя абставіны, інструктары і бухгалтары райЗА і МТС, а таксама і інструктары-ўчотчыкі амаль ніколі ў калгасах не бываюць і становішча ўчота не кантралююць, не дапамагаюць маласвядомым рахункаводам у іх рабоце, а замест гэтага адседжваюцца ў сябе ў канцыляры, топячыся ў бюракратызме.

За незавядзенне большасці раздзелаў у журнале ф. №—1 па калгасах, ф. № 2—3 па калгасніках і аднаасобніках па Мехаўскаму сельсовету—сакратару Мехаўскага сельсовета т. Рыбікаву аб‘явіць суровую вымову; адначасова адзначыць, што тав. Рыбікаў заслугоўвае зняцця з работы сакратара сельсовета і перадачы суду, але, улічваючы тое, што старшыня сельсовета нова-прызначаны,—таму заставіць тав. Рыбікава на рабоце сакратара сельсовета, прапанаваўшы яму ліквідаваць у бліжэйшыя дні запушчэнне па ўчоту.

За нездавальняючае вядзенне ўчота па Паташонскаму с/с сакратару с/с тав. Рудзячанку, па Горкаўскаму тав. Патапенку—аб‘явіць вымову; адначасова папярэдзіць астатніх сакратароў, што, калі імі ў бліжэйшыя дні не будзе поўнасцю ліквідавана адставанне па ўчоту,—да іх будуць прыняты больш суровыя меры ўздзейнічання, а тав. Бажонку праверыць да 1/XII—37 г. становішча ўчота па гэтых, сельсоветах у другі раз.

Прэзідыум адзначае нездавальняючае становішча рахункаводства па большасці калгасаў, дзе вытварана праверка ў большай частцы калгаснага рахункаводства незразумела; прапанаваць заг. райЗА і дырэктару МТС у першую чаргу накіраваць інструктароў і бухгалтароў у адстаючыя калгасы, быць у калгасах не менш 80 проц. учотнага часу.

З мэтай павышэння кваліфікацыі работаючых рахункаводаў калгасаў і падрыхтоўкі новых, больш працаздольных для замены непрыгодных, прапанаваць райЗА арганізаваць курсы рахункаводаў не пазней студзеня месяца 1938 г., для чаго зараз-жа правесці падрыхтоўчую работу, у асаблівасці па падбору кадраў.

Ацэнка работы райінспектур наргасучота за лістапад м-ц 1937 г.

Назва раёнаў	Катэгорыі	Механічны рух насельніцтва	Натуральны рух насельн.	Бюджэты	Учот працы ў прамысловасці (ф. 1, 1-а)	Дзетсады	Клубы і бібліятэкі	Цэны калгасна-баз. гандлю	Сярэдні бал
1. Асвейскі	2	5	4	—	4	4	4	3	4,0
2. Асіпавіцкі	2	5	5	—	2	5	4	5	4,3
3. Бабруйскі	2	5	5	—	2	5	0	4	3,5
4. Багушэўскі	2	4	5	—	4	5	4	4	4,3
5. Барысаўскі	3	4	3	4	3	4	4	2	3,4
6. Бешанковіцкі . .	2	5	4	—	4	5	4	4	4,3
7. Брагінскі	2	5	5	3	2	4	4	4	3,8
8. Будакашалеўскі . .	1	5	5	—	5	5	4	4	4,6
9. Быхаўскі	2	5	4	—	3	5	4	3	4,0
10. Бягомльскі	2	5	4	—	4	4	4	3	4,0
11. Бялыніцкі	2	5	5	—	4	5	4	2	4,1
12. Бярэзінскі	3	5	1	2	2	4	0	4	2,5
13. Веткаўскі	2	5	5	—	3	5	4	0	3,6
14. Ветрынскі	2	5	5	—	3	5	4	4	4,3
15. Віцебск (горад) . .	3	4	5	3	3	0	4	4	3,2
16. Віцебскі	4	—	5	—	2	0	0	—	1,7
17. Гарадоцкі	2	5	5	—	2	5	4	4	4,1
18. Глускі	2	5	4	—	2	4	4	4	3,8
19. Гомель (горад) . . .	2	4	5	4	3	4	5	5	4,2
20. Гомельскі	2	—	4	—	4	5	4	—	4,2
21. Горацкі	3	5	4	4	3	0	0	5	3,0
22. Грэскі	3	4	1	3	2	4	4	4	3,1
23. Даманавіцкі	2	3	5	2	5	5	4	4	4,0
24. Добрушскі	2	5	5	2	2	3	4	4	3,5
25. Дрыбінскі	2	5	5	—	2	5	4	4	4,1
26. Дрысенскі	2	5	5	2	3	5	4	4	4,0
27. Дубровенскі	3	4	4	3	2	4	4	3	3,4
28. Ельскі	2	4	5	—	2	5	4	4	4,0
29. Жлобінскі	2	5	4	—	2	4	4	4	3,8
30. Журавіцкі	2	5	4	—	2	4	4	4	3,8
31. Жыткавіцкі	3	3	5	0	2	5	4	4	3,2
32. Заслаўскі	2	5	5	—	2	5	4	3	4,0
33. Камарынскі	2	5	4	—	2	5	4	4	4,0
34. Капаткевіцкі . . .	2	4	3	—	2	5	4	3	3,5
35. Кармянскі	2	5	3	3	3	5	4	4	3,8
36. Касцюковіцкі . . .	1	5	5	—	5	5	5	5	5,0
37. Кіраўскі	2	5	5	—	4	5	0	—	3,8
38. Клімавіцкі	2	4	4	3	3	4	4	4	3,7
39. Клічаўскі	2	5	4	—	2	4	4	4	3,8
40. Копыльскі	2	5	5	—	3	5	4	4	4,3
41. Круглянскі	2	5	5	—	2	5	4	4	4,1
42. Крупскі	2	5	4	—	4	5	4	4	4,3
43. Крычаўскі	2	5	4	—	3	5	4	2	3,8
44. Лагойскі	2	4	5	—	2	5	4	4	4,0
45. Лельчыцкі	1	5	5	—	4	5	4	5	4,6
46. Лепель (город) . .	2	5	4	—	3	5	4	5	4,3
47. Лепельскі	3	5	4	—	2	5	0	—	3,2
48. Лёзненскі	2	5	4	—	4	0	4	5	3,6

Ацэнка работы райінспектур наргасучота за лістапад м-ц 1937 г.

Назва раёнаў	Катэгорыі	Механічны рух насельніцтва	Натуральны рух насельн.	Бюджэты	Учот працы ў прамысловасці (ф. 1, 1-а)	Дзетсады	Клубы і бібліятэкі	Цэны калгас-на-баз. гандлю	Сярэдні бал
49. Лоеўскі	1	5	4	—	5	5	4	4	4,5
50. Любаньскі	1	5	5	—	4	5	4	4	4,5
51. Магілеў (горад)	2	4	5	—	3	5	4	4	4,1
52. Магілеўскі	3	—	5	—	4	3	0	—	3,0
53. Мазыр (горад)	2	5	5	—	3	5	4	4	4,3
54. Мазырскі	2	5	3	—	5	5	4	—	4,4
55. Менск (горад)	1	5	5	—	3	5	4	5	4,5
56. Менскі	2	4	4	2	4	5	4	—	3,8
57. Мехаўскі	2	5	5	—	2	4	4	2	3,6
58. Мсціслаўскі	2	5	5	—	3	4	4	5	4,3
59. Нараўлянскі	2	5	5	—	2	5	4	5	4,3
60. Аршанскі	1	5	5	—	3	5	4	5	4,5
61. Парыцкі	3	5	5	—	2	4	0	4	3,3
62. Петрыкаўскі	2	3	4	—	3	5	4	4	3,8
63. Плешчаніцкі	3	4	4	—	2	5	4	0	3,1
64. Полацк (горад)	2	5	5	—	3	5	4	4	4,3
65. Полацкі	2	5	5	—	4	5	0	—	3,8
66. Прапойскі	2	2	4	—	—	4	4	4	3,6
67. Пухавіцкі	1	5	5	—	4	5	4	4	4,5
68. Рагачоўскі	1	5	5	—	4	5	4	4	4,5
69. Расонскі	3	4	4	4	3	5	4	0	3,4
70. Рэчыцкі	2	5	4	4	3	4	5	5	4,2
71. Свяцілавіцкі	2	5	5	—	3	5	4	—	4,4
72. Сенненскі	3	5	5	—	2	4	0	3	3,1
73. Сіроцінскі	2	5	5	—	2	5	5	4	4,3
74. Слуцк (горад)	2	5	5	—	3	5	4	0	3,6
75. Слуцкі	2	5	5	3	2	4	4	—	3,8
76. Смалявіцкі	2	5	5	—	2	4	4	4	4,0
77. Смілавіцкі	2	5	5	—	2	5	4	5	4,3
78. Старадарожскі	2	5	5	—	2	4	4	4	4,0
79. Старобінскі	2	5	5	—	5	4	4	0	3,8
80. Суражскі	2	5	5	3	3	5	4	3	4,0
81. Талачынскі	2	4	4	—	4	4	4	4	4,0
82. Тураўскі	2	5	4	—	2	4	4	4	3,8
83. Уваравіцкі	2	5	4	—	2	4	4	5	4,0
84. Уздзенскі	1	5	5	—	5	4	4	4	4,5
85. Ушацкі	2	5	4	—	4	5	4	3	4,1
86. Халопеніцкі	2	5	4	—	3	5	4	0	3,5
87. Хоцімскі	2	5	5	—	2	4	4	5	4,1
88. Хойніцкі	2	5	5	—	2	5	4	5	4,3
89. Церахоўскі	2	5	5	—	2	4	4	4	4,0
90. Чавускі	1	5	5	—	4	5	4	4	4,5
91. Чачэрскі	2	5	5	—	4	4	0	3	3,5
92. Чашніцкі	2	4	5	2	4	4	4	4	3,8
93. Чырвонапольскі	2	5	4	—	2	4	4	4	3,8
94. Чырвонаслабодскі	2	5	5	—	3	5	4	2	4,0
95. Чэрвеньскі	1	5	5	—	4	5	4	5	4,6
96. Чэрыкаўскі	2	5	5	—	5	4	0	5	4,0
97. Шклоўскі	3	5	5	—	3	0	0	3	2,6

Пералік спраў, якія павінны быць заведзены ў райінспектурах наргасучота на 1938 г.

01. Пастановы ЦВК, СНК, СПА і мясцовых партыйных і совецкіх арганізацый па ўсіх галінах учота і справаздачнасці.

02. Пастановы і загады УНГУ і ЦУНХУ.

03. Арганізацыйныя пытанні райінспектуры і ўчастковай інспектуры (аб штатах, падборы работнікаў, кіраўніцтва і т. д.).

04. Сельсовецкі ўчот і справаздачнасць (пастановы СНК і мясцовых партыйных і совецкіх арганізацый, цыркулярныя лісты ЦУНХУ і УНГУ, пастановы аб змене і дапаўненні сельсовецкага ўчота і т. д.).

05. Учот і справаздачнасць аддзелаў РВК (пастановы СНК і мясцовых партыйных і совецкіх арганізацый, цыркулярныя лісты ЦУНХУ і УНГУ, пастановы аб змене і дапаўненні райвыканкомаўскай справаздачнасці).

06. Аб парушэнні ўчотнай дысцыпліны (акты і перапіска аб увядзенні незаконных форм учота і справаздачнасці, дача, няправільных звестак передача спраў ; прэзідыума РВК і райпракуратуры).

07. Учот прамысловасці рэспубліканскага і саюзнага значэння (перапіска і ўчотна-статыстычныя матэрыялы).

08. Учот прамысловасці мясцовага значэння (перапіска і ўчотна-статыстычныя матэрыялы).

09. Учот працы і зарплаты (перапіска і ўчотна-статыстычныя матэрыялы).

10. Учот капітальнага будаўніцтва (перапіска і ўчотна-статыстычныя матэрыялы).

11. Учот комунальнай гаспадаркі (перапіска і ўчотна-статыстычныя матэрыялы).

12. Учот совецкага гандлю і грамадскага харчавання (перапіска і ўчотна-статыстычныя матэрыялы).

13. Учот культуры, навукі і кадраў (перапіска і ўчотна-статыстычныя матэрыялы).

14. Учот насельніцтва (перапіска і ўчотна-статыстычныя матэрыялы).

15. Учот аховы здароўя і соцыяльнага забеспячэння (перапіска і ўчотна-статыстычныя матэрыялы).

16. Справа для кан'юнктурных матэрыялаў па эканоміцы раёна.

17. Учот пасеўных плошчаў (заключная справаздача па пасеўных плошчах.)

18. Учот ураджайнасці (вызначэнне відаў на ўраджай, вымярэнне ўраджаю).

19. Учот жывёлы: а) перапіс жывёлы на 1 лютага, б) чэрвеньскі ўчот, в) квартальныя справаздачы ферм.

20. Аб пастаноўцы ўчота і справаздачнасці ў калгасах, МТФ і соўгасах.

21. Справа з грашовымі дакументамі і справаздачамі.

На ўсіх адносінах, пасылаемых райінспектурай у КНГУ, неабходна абавязкова ставіць нумар адпаведнай справы (напрыклад, на адносінах аб штатах і прыёме работнікаў ставіцца нумар 03 і т. д).

Да ведама раённых і ўчастковых інспектароў

Гэтым паведамляем №№ тэлефонаў УНГУ БССР


Начальнік Кіраўніцтва	21-152
Нам. начальніка Кіраўніцтва Абудзееў	21-155
" " " Шындлер	21-154
Сакратар начальніка кіраўніцтва	21-153
Аддзел учота сельскай гаспадаркі	25-029
" " прамысловасці	25-032
" " савецкага гандлю	25-034
" " будаўніцтва	21-157
" " працы	21-156
" " насельніцтва і аховы здароўя	22-592
" бюджэтаў калгаснікаў	23-768
" механізацыі	25 625
Учотная інспекцыя	23-767
Бюро перапісу насельніцтва	25 031
Спецаддзел	24-752
Адміністрацыйна-гаспадарчы аддзел і кадры	25 030
Бухгалтэрыя	25-028
Экспедыцыя	23-769



Адказны рэдактар В. Магідаў

Здана ў друк 14/XII 1937 г. Падпісана да друку 16/XII 1937 г.
Галоўліт БССР № 3508. Аб'ём друкав. арк. 2½. Тыраж 600 экз.

Заказ № 5739. „Палесдрук", Гомель, Совецкая, 1.


B000000002379463